# НАЦЫЯНАЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА БЕЛАРУСІ – ЦЭНТР БІБЛІЯГРАФІЧНАГА АСВЕТНІЦТВА

Шматвяковая кніжная культура беларусаў сведчыць, што наш народ заўжды любіў і шанаваў чытанне. Вялікія кніжнікі, такія, як Ефрасіння Полацкая, Францыск Скарына і тысячы другіх: вядомых і тых, чые імёны забыліся, у мінулым і сёння імкнуліся зрабіць здабыткі духоўнай культуры, адлюстраваныя ў кнізе, зразумелымі і даступнымі для ўсіх людзей, прывіць нават не атрымаўшым добрую адукацыю прыхільнасць да чытання. Аднак не толькі выдатныя і інтэлігентныя людзі выступалі як кніжныя асветнікі. Адметнасць асветніцтва ў нашай краіне ў XX ст. у тым, што буйнейшым яго цэнтрам стала Нацыянальная бібліятэка Беларусі.

СВЯТЛАНА ЗЫГМАНТОВІЧ,
ВАЛЯНЦІНА САІТАВА

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Створаная ў 1922 г. (позна! — калі разглядаць у сусветным кантэксце развіцця дадзенага тыпу бібліятэк) галоўная навуковая публічная бібліятэка пачала развіваць усе функцыі, характэрныя для нацыянальных кнігасховішчаў: хутка назапашваліся фонды нацыянальных дакументаў, выдадзеных як на тэрыторыі рэспублікі, так і за яе межамі (экстэрыёрыкі), крыніц інфармацыі па ўсіх галінах ведаў, наладжвалася бібліятэчна-бібліяграфічнае абслугоўванне ў розных формах, ствараліся крыніцы нацыянальнай рэтраспектыўнай бібліяграфіі і іншыя накірункі дзейнасці. Гэтыя функцыі, падкрэслім яшчэ раз, былі і на сённяшні дзень застаюцца тыповымі для нацыянальных бібліятэк розных краін свету.

Месца, роля і функцыі нацыянальных бібліятэк на працягу XIX і XX стст. застаюцца прадметам пастаяннага вывучэння і аналізу з боку вядомых арганізатараў і даследчыкаў бібліятэчнай справы як у асобных краінах, так і міжнародных органаў (ЮНЕСКА, IFLA і інш.). Па гэтай праблеме існуе вялікая колькасць публікацый. Напрыклад, у выдадзеным у Лондане — Бостане (1977) кіраўніцтве па ўпраўленню развіццём нацыянальнага бібліятэчнага і інфармацыйнага абслугоўвання прыведзены наступныя функцыі Нацыянальнай бібліятэкі (НБ): асноўнае кнігасховішча і цэнтр апрацоўкі і абслугоўвання для ўсіх айчынных выданняў, выданняў экстэрыёрыкі і замежных матэрыялаў; складальнік нацыянальнай бібліяграфіі; цэнтр унутранага і міжнароднага абмену выданнямі і інфармацыяй; цэнтр каардынацыі бібліятэчнага абслугоўвання. Восем функцый НБ і азначэнне гэтага тыпу бібліятэк падала вядомы бібліятэказнаўца Н.І.Цюліна ў манаграфіі "Национальная библиотека" (1988). Аднак ні ў прыведзеных прыкладах, ні ў другой літаратуры не сустракаецца функцыя бібліяграфічнага асветніцтва, якую мы вылучылі ў дзейнасці НББ. Н.І.Цюліна, як і многія іншыя даследчыкі, справядліва адзначала, што ў складзе функцый канкрэтнай НБ могуць быць функцыі, выкліканыя ўмовамі дзейнасці, асаблівасцямі культурнага развіцця і г.д. Добра вядома таксама, што на канцэпцыю нацыянальнай бібліятэкі заметны ўплыў аказвае асоба яе кіраўніка. У замежным бібліятэказнаўстве даследчыкі разглядаюць развіццё нацыянальнай бібліятэкі ў перыяд дырэктарства пэўнага кіраўніка. Прэтэндэнт на такую пасаду прапануе канцэпцыю развіцця НБ.

Неабходна адзначыць, што першы дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі (тады ДБ БССР) І.Б.Сіманоўскі таксама аказаў значны ўплыў на яе адметнасць. Выдатны арганізатар і знаўца бібліятэчна-бібліяграфічнай справы І.Б.Сіманоўскі ўпершыню ў дзейнасці бібліятэкі такога ўзроўню ўбачыў магутны патэнцыял для развіцця новай функцыі — папулярызацыі ведаў сярод шырокіх колаў насельніцтва, чытачоў усёй краіны. Вядома, што да метадаў і форм папулярызацыі пісьменнасці і ведаў звярнуліся бібліятэкі для народа ў другой палове XIX ст. і больш актыўна ў XX ст., калі пачалі стварацца цэлыя сеткі публічных бібліятэк. Такія бібліятэкі ў некаторых краінах называлі народнымі універсітэтамі. Аднак гэта дзейнасць не распаўсюджвалася сярод навуковых бібліятэк, тым больш нацыянальных.

Як чалавек і кіраўнік, захоплены ідэямі сацыялістычнага будаўніцтва, І.Б.Сіманоўскі ў 20—30-ыя гг. палітыка-асветную прапаганду лічыў важнейшай сярод усіх напрамкаў, і гэта паўплывала на характар і змест асветніцкай дзейнасці Бібліятэкі. Пункт гледжання І.Б.Сіманоўскага актыўна падтрымалі вядомыя дзеячы бібліятэчна-бібліяграфічнай справы СССР Л.Н.Трапоўскі і А.Э.Вольцэнбург і інш. Аднак расійскія бібліёграфы цэнтрамі прапаганды кнігі бачылі спецыяльныя бібліяграфічныя інстытуты, і такія інстытуты дзейнічалі ў РСФСР (у даваенны час паслядоўна працавалі Інстытут рэкамендацыйнай бібліяграфіі, Крытыка-бібліяграфічны інстытут, Навукова-даследчы інстытут бібліятэказнаўства і рэкамендацыйнай бібліяграфіі).

І.Б.Сіманоўскі ж упэўнена сцвярджаў, што дзяржаўная рэспубліканская бібліятэка, як і масавая, павінна здзяйсняць палітыка-асветную прапаганду.

Здзейсніць самую ідэю для ДБ БССР відавочна магчыма было толькі, выкарыстоўваючы бібліяграфічную інфармацыю і менавіта з дапамогай рэкамендацыйнай бібліяграфіі, метадалогія і тэхналогія якой традыцыйна абумоўліваліся асветніцкімі мэтамі. Таму ў 1932 г. у ДБ БССР была створана група па рэкамендацыйнай бібліяграфіі, укамплектаваная лепшымі кадрамі, якія, дарэчы, сталі першымі аспірантамі ў нашай рэспубліцы ў галіне бібліятэчнай справы. Такім чынам, упершыню галоўная навуковая бібліятэка краіны ўзяла на сябе абавязак бібліяграфічнага асветніцтва — адмысловую функцыю, якая здзяйснялася раней толькі масавымі бібліятэкамі і такімі выдатнымі асветнікамі, як Х.Д.Алчэўская, М.А.Рубакін.

ДБ БССР пачала выдаваць разнастайныя па форме і прызначэнню рэкамендацыйна-бібліяграфічныя матэрыялы, надаючы адпаведнае значэнне грамадска-палітычнай тэматыцы, пытанням сацыялістычнага будаўніцтва, якія на доўгія дзесяцігоддзі саставілі ядро ведаў, што даводзіліся да грамадзян з дапамогай сістэмы ідэалагічнай работы, адукацыі і другімі сродкамі. Аднак неабходна адзначыць, што фактычна ад пачатку рэкамендацыйна-бібліяграфічнай дзейнасці Бібліятэка выйшла за межы палітыка-асветнай тэматыкі і даводзіла да шырокіх колаў чытачоў, да бібліятэчных работнікаў рэкамендацыйна-бібліяграфічную інфармацыю (РБІ) аб лепшай літаратуры, выпушчанай у рэспубліцы. Рэспубліканскі дакументны паток па розных галінах ведаў адлюстроўваўся ў выданнях ДБ БССР — часопісе "Кніга — масам", "Крытыка-бібліяграфічным бюлетэні" (першая палова 30-ых гг.). Так, у "Крытыка-бібліяграфічным бюлетэні" ў самастойных раздзелах змяшчаліся анатацыі на новыя беларускія кнігі, рэцэнзіі і паказальнікі крытычных матэрыялаў. Анатацыі складаліся на лепшыя кнігі грамадска-палітычнай, тэхнічнай, прыродазнаў-

чай, медыцынскай, сельскагаспадарчай тэматыкі, на мастацкія творы і іншую літаратуру. Складальнікі добра валодалі методыкай анатавання: раскрывалі тэматыку кніг і вывады аўтара, чытацкае прызначэнне, прыводзілі цытаты і інш. Рэцэнзіі ў другім раздзеле прысвячаліся “найбольш актуальнай масавай кнізе”.

У трэцім раздзеле бібліяграфаваліся крытычныя матэрыялы з перыёдыкі СССР на беларускія выданні, у т.л. перакладныя. Прыводзіліся найбольш яскравыя фрагменты з рэцэнзій. Для рэцэнзавання кніг Бібліятэка змагла прыцягнуць вучоных з




Акадэміі навук, выкладчыкаў БДУ, пісьменнікаў і крытыкаў. “Крытыка-бібліяграфічны бюлетэнь” з арганізацыйна-метадычнага боку несумненна быў прыкметным дасягненнем Бібліятэкі, аб чым сведчаць аператыўнасць і шырыня адлюстравання кніжнага патоку БССР, дакладнасць структуры, імкненне з удзелам высокапрафесіянальных спецыялістаў дапамагчы чытачам разабрацца ў вартасцях кожнага твора, адрасаванага шырокай чытацкай аўдыторыі. Аднак дух таталітарнай ідэалогіі, нецярпімасць да тых твораў, у якіх, на погляд крытыкаў, сацыялістычныя савецкія ідэі не былі паказаны належным чынам, пранізваў матэрыялы бюлетэня. Гэты адбітак канкрэтна-гістарычных умоў, у якіх знаходзілася краіна, дэфармаваў сутнасць бібліяграфічнага асветніцтва, надаваў яму неўласцівую, у параўнанні з бібліяграфічнымі дапаможнікамі Х.Д.Алчэўскай, М.А.-Рубакіна, І.І.Янжула, акрэсленую партыйна-палітычную накіраванасць, абумоўліваў насычанасць мовы бібліяграфічных паведамленняў палітычнымі і ідэалагічнымі тэрмінамі і адзнакамі. Матэрыялы, напісаныя, напрыклад, Л.Бэндэ, сёння выклікаюць перш за ўсё шкадаванне і абурэнне, але, безумоўна, належаць да “рэвалюцыйна-марксісцкіх па крытэрыях і метадах ацэнкі”, — такім трапным выразам ахарактарызаваў буйнейшы савецкі бібліёграф Л.Н.Трапоўскі ідэйна-метадалагічную сутнасць рэкамендацыйнай бібліяграфіі ў той час.

Напэўна, не толькі кадравыя і матэрыяльна-тэхнічныя цяжкасці прывялі да спынення буйных рэкамендацыйна-бібліяграфічных прац ДБ БССР, у т.л. “Крытыка-бібліяграфічнага бюлетэня”. Цяжар палітычнага, ідэалагічнага ціску знішчаў саму сутнасць бібліяграфічнага асветніцтва: прапагандаваць, прапаноўваць чытачам усё багацце думак, ідэй, зместу, формы твораў мінулага і сучаснасці, каб стварыць найлепшыя ўмовы для індывідуальнага выбару. Невыпадкова група па рэкамендацыйнай бібліяграфіі як самастойная праіснавала нядоўга, і функцыі па падрыхтоўцы рэкамендацыйна-бібліяграфічных матэрыялаў у даваенны час па чарзе даручаліся шэрагу аддзелаў ДБ БССР. Бібліятэка перайшла на падрыхтоўку пераважна тэматычных дапаможнікаў да шматлікіх грамадска-палітычных кампаній і юбілейных дат.

Вопыт арганізацыі рэкамендацыйнай бібліяграфіі на базе Дзяржаўнай бібліятэкі атрымаў распаўсюджанне ва ўсім СССР: у ДБ СССР і дзяржаўных бібліятэках саюзных рэспублік. У партыйных і ўрадавых пастановах па бібліятэчнай справе ў перыяд з другой паловы 30-ых да канца існавання СССР гэты накірунак дзейнасці бібліятэк пачаў разглядацца як адзін з важнейшых. Для ДБ БССР вымушаны перапынак быў




звязаны толькі з перыядам Вялікай Айчыннай вайны.

Пасля вызвалення ад нямецка-фашысцкіх акупантаў ДБ з руін аднаўляла не толькі матэрыяльна-тэхнічную базу, але і свае функцыі, у т.л. бібліяграфічнага асветніцтва. У 1951 г. у Бібліятэцы быў створаны навукова-бібліяграфічны аддзел, у якім рэкамендацыйна-бібліяграфічная дзейнасць была адзінай функцыяй да 1988 г. Далей і да сённяшняга часу аддзел працуе як у галіне рэкамендацыйнай (існуе сектар), так і навукова-дапаможнай бібліяграфіі. Традыцыі бібліяграфічнага асветніцтва ўспрынялі створаныя ў пасляваенныя гады абласныя бібліятэкі, якім пазней быў нададзены статус універсальных навуковых. Да гэтай дзейнасці далучыліся галіновыя рэспубліканскія бібліятэкі і ЦБС. Такім чынам, яна набыла важнейшыя рысы: бесперапыннасці, сістэмнасці (па зместу і другіх параметрах), найзручнейшай метадычнай прыстасаванасці для чытачоў. НББ стала аказваць навукова-метадычную дапамогу другім бібліятэкам па развіццю бібліяграфічнага асветніцтва. Трэба адзначыць, што НББ спрыяла развіццю каардынацыйных адносінаў паміж удзельнікамі рэкамендацыйна- бібліяграфічнага працэса.

На працягу першага пасляваеннага дзесяцігоддзя рэкамендацыйна-бібліяграфічная дзейнасць ДБ БССР і другіх бібліятэк была падначалена “пераадоленню нездавальняючага стану ідэалагічнай работы ў БССР”, як было адзначана ў спецыяльнай пастанове ЦК ВКП(б) у 1947 г., і забеспячэнню “паўсядзённага кіраўніцтва і кантроля за ідэйным зместам выдаваемай літаратуры”. Паказальным з’яўляецца той факт, што на працягу 1947 — 1955 гг. значная частка рэкамендацыйна-бібліяграфічных дапаможнікаў грамадска-палітычнай тэматыкі была прысвечана выбарам у саветы дэпутатаў працоўных і гадавінам Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Паляпшэнне грамадска-палітычнай сітуацыі ў краіне станоўча адбілася на рэкамендацыйна-бібліяграфічнай дзейнасці ДБ. З сярэдзіны 50-ых гг. Бібліятэка пачала выпускаць 15 — 20 найменняў бібліяграфічных дапаможнікаў у год, павялічыла долю дапаможнікаў беларусазнаўчай тэматыкі і на беларускай мове. З пачатку 60-ых гг. галоўная ўвага пачала надавацца праблеме стварэння рэспубліканскай сістэмы рэкамендацыйна-бібліяграфічных дапаможнікаў і павышэнню эфектыўнасці РБІ у чытанні і прапагандзе кнігі. Сістэма рэкамендацыйнай бібліяграфічнай інфармацыі дазваляла ахапіць увесь паток літаратуры, прызначанай для шырокіх колаў насельніцтва, усе катэгорыі чытачоў, бесперапынна забяспечваць найбольш важныя галіны ведаў і цікавыя тэмы, рэалізаваць найбольш прыдатную методыку. Хаця ў тэматыцы дапаможнікаў і ў метадычных прыёмах можна выявіць нямала фактаў негатыўнага ўплыву прамога служэння афіцыйнай ідэалогіі, у




РЭПАЗІТОРЫЙ БДУ




пасляваенны перыяд мы не бачым тых рэзкіх ацэнак, для якіх галоўным было вызначыць ідэйную платформу аўтара. Большая ўвага стала надавацца таму, якія карысныя ці цікавыя веды мог атрымаць чытач, як іх бесперапынна папаўняць, пастаянна быць у курсе кніжных навінаў, як пашырыць веданне кола аўтараў, узбагаціць уяўленні аб эстэтыцы мастацкага слова і вобраза. І менавіта гэтыя традыцыі сапраўднага бібліяграфічнага асветніцтва выклікалі інтарэс чытачоў і бібліятэкараў да рэкамендацыйна-бібліяграфічных матэрыялаў.

І.Б.Сіманоўскі на працягу ўсяго пасляваеннага часу неаднаразова спрабаваў наладзіць выхад бягучага бібліяграфічнага дапаможніка, здольнага раскрыць для чытачоў тую частку дакументнага патоку, якая адрасавана для агульнай і часткова прафесіянальнай адукацыі, самаадукацыі і вольнага часу. Нарэшце, з 1960 г. пачаў выдавацца штомесячны бібліяграфічны бюлетэнь “Новыя кнігі БССР”, з дапамогай якога чытачы і бібліятэкары атрымалі магчымасць арыентавацца ў патоку новых беларускіх выданняў і публікацый у перыядычным друку, знаёміцца з тэматычнымі рэкамендацыйна-бібліяграфічнымі матэрыяламі. Дапаможнік хутка набыў шырокую папулярнасць у бібліятэках краіны, без перабольшвання стаў адным з лепшых беларускіх бібліяграфічных выданняў. З гэтага часу Бібліятэка пачынае штогод павялічваць выпуск рэкамендацыйна-бібліяграфічных дапаможнікаў, каб у розных іх тыпах, жанрах і формах прадставіць лепшую частку друкаванай прадукцыі, зрабіць бібліяграфічныя паведамленні найбольш зручнымі і даступнымі для чытачоў. Існуе нямала крыніц, якія сведчаць аб выкарыстанні рэкамендацыйна-бібліяграфічных матэрыялаў беларускімі чытачамі, бібліятэкарамі для індывідуальнай рэкамендацыі літаратуры, для правядзення разнастайных форм нагляднай і масавай культурна-асветнай работы з насельніцтвам.

Час перабудовы, а затым і дасягненне дзяржаўнай незалежнасці спрыяльна адбіліся на рэкамендацыйнай бібліяграфіі. Унутраная падрыхтаванасць бібліёграфаў да раскрыцця здабыткаў духоўнай культуры дапамагла без жалю адкінуць дагматычныя метады, навязваемую тэматыку. Ідэалагічная заангажаванасць савецкай рэкамендацыйнай бібліяграфіі на рубяжы 80—90-ых гг. стала аб'ектам вострай і прынцыповай крытыкі. Сістэма рэкамендацыйнай бібліяграфічнай інфармацыі ў рэспубліцы хутка набыла абрысы, якія лічыў важнейшымі М.А.Рубакін, каб аказаць чытачам сур'ёзную дапамогу ў паглыбленні і пашырэнні ведаў. У гэтай сістэме выдатныя бібліяграфічныя выданні Нацыянальнай бібліятэкі “Новыя кнігі: па старонках беларускага друку”, “Беларуская мова, літаратура, мастацтва”, “Знамянальныя і памятныя даты сусветнага календара” займаюць вядучае месца, ствараюць умовы для забеспячэння неабмежавана шырокага патоку патрэб чытачоў ва ўзбагачэнні і ўдасканаленні свайго духоўнага свету.

У сучасных умовах дзейнасці НББ па бібліяграфічнаму асветніцтву абумоўлена наяўнасцю такіх фактараў, як рэалізацыя прынцыпу даступнасці да нацыянальных дакументаў і распрацоўка аўтаматызаванай тэхналогіі папулярызацыі ведаў. Ідэя забеспячэння доступу да назапашаных нацыянальнымі бібліятэкамі унікальных інфармацыйных рэсурсаў — здабыткаў нацыянальнай культуры і інтэлектуальнай спадчыны народаў — стала сёння адной з асноўных у перааснэнсаванні канцэпцыі гэтых бібліятэк. Яна вырашаецца ў тэарэтычных пабудовах праз прадастаўленне інфармацыйных рэсурсаў нацыянальных бібліятэк у сусветных інфармацыйных сетках. Практычная рэалізацыя такога доступу для большасці НБ пакуль яшчэ недасягальная. Да таго ж неабходна дадаць, што самастойна весці пошук даных, якія дапамогуць чалавеку павышаць свой агульнакультурны ўзровень у Інтэрнэт ці іншых сетках, — справа вельмі няпростая. Неабходна дасканала валодаць сістэмай пошуку, базамі даных, якія дапамагаюць у навігацыі. І гэта майстэрства даступна не кожнаму карыстальніку. Але нават прадастаўленне інфармацыйных рэсурсаў НБ у аўтаматызаваных сетках не гарантуе належных умоў для здзяйснення выбару карыстальнікаў, якія існуюць у традыцыйнай методыцы і тэхналогіі рэкамендацыйнай бібліяграфіі. Гэта гаворыцца не для таго, каб сумнявацца ў магчымасцях прымянення новых тэхналогій для бібліяграфічнага асветніцтва, але толькі для таго, каб прызваць НБ мэтанакіравана распрацоўваць інфармацыйную тэхналогію папулярызацыі ведаў. Мы ўпэўнены, што прадастаўленне электронных версій “Новых кніг: па старонках беларускага друку”, паказальнікаў “Беларуская мова, літаратура, мастацтва” і іншых у онлайнавым доступе, на CD-ROM, іх кумулятыўных варыянтаў значна пашырыла б кола карыстальнікаў Бібліятэкі і дапамагло б выкарыстаць анімацыйныя і іншыя сродкі для ўдасканалення якасці інфармацыі. Можна толькі ўявіць, наколькі карыснымі былі б такія матэрыялы для настаўніка і выхавацеля, для сям'і. На жаль, гэта яшчэ толькі пажаданні. Адсутнасць магчымасці выкарыстання аўтаматызаванай тэхналогіі для папулярызацыі ведаў не павінна тармазіць выкарыстанне тэхналагічных магчымасцей сучасных СМІ. Прапануем Бібліятэцы распачаць бібліяграфічна-асветніцкую праграму на рэспубліканскім тэлебачанні. Бачыцца, што візуальныя і гукавыя сродкі ТБ дапамогуць узмацніць інтэлектуальна-пачуццёвы комплекс рэкамендацыйна-бібліяграфічнай інфармацыі.

Сёння з дапамогай прадуманай сістэмы рэкамендацыйна-бібліяграфічных дапаможнікаў да карыстальнікаў штогод паступаюць многія сотні рэкамендацыйна-бібліяграфічных паведамленняў. Гэты паток структурыраваны такім чынам, каб забяспечыць шырокі і разнастайны спектр чытацкага попыту і інтарэсаў у сферах адукацыі, самаадукацыі і вольнага часу. Упершыню так шырока і поўна НББ разгарнула папулярызацыю нацыянальнай культурнай спадчыны, у т.л. такіх яе старонак, якія на доўгія дзесяцігоддзі і нават стагоддзі наўмысна выкрэсліваліся з народнай памяці. З улікам гэтых і іншых мэтаў самаадукацыйнага чытання былі ўнесены змяненні ў дапаможнікі “Новыя кнігі: па старонках беларускага друку”, “Беларуская мова, літаратура, мастацтва”. Асобна трэба падкрэсліць, што ў замежных бібліятэках няма паказальнікаў, якія па замыслу і якасці можна было б параўнаць з “Новымі кнігамі”. Гэты адмысловы бібліяграфічны дапаможнік забяспечвае даступнасць да нацыянальных дакументаў і фондаў НББ многіх бібліятэк і чытачоў краіны. НББ пастаянна знаходзіцца ў пошуку новых форм і метадаў удасканалення бібліяграфічнай папулярызацыі. Сёння Бібліятэцы можна раіць больш рэкламіраваць гэты важнейшы, маючы нацыянальна-культурнае значэнне накірунак дзейнасці, а кіруючыя культурай органы павінны аказаць магчымую падтрымку Бібліятэцы па ўдасканаленню гэтай работы. Асабіста мы ўпэўнены, што асветніцкая дзейнасць НББ аказвае станоўчы ўплыў на духоўную культуру насельніцтва краіны, і сама бібліятэка заслугоўвае ўзнагароды на дзяржаўным узроўні як выдатны асветніцкі цэнтр.

Summary

The activity of National library of Belarus in the field of the recommendational bibliography is considered in the article.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ